САНІТАРНЫЯ ВЕДЫ — У МАСЫ

Д. Е. ЗІБІЦКЕР

ШАЛЕНСТВА І СПОСАБЫ БАРАЦЬБЫ З ГЭТЫМ ЗАХВОРВАННЕМ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК 1956

МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ
БЕЛАРУСКАЙ ССР

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ ЭПІДЭМІЯЛОГІІ,
МІКРАБІЯЛОГІІ І ГІГІЕНЫ

Старшы навуковы супрацоўнік
Д. Е. ЗІБІЦКЕР

ШАЛЕНСТВА І СПОСАБЫ БАРАЦЬБЫ З ГЭТЫМ ЗАХВОРВАННЕМ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
Рэдакцыя навукова-тэхнічнай літаратуры
МІНСК 1956

Надрукавана
Дзяржаўным выдавецтвам БССР
па заказу
Міністэрства аховы здароўя БССР

УЗБУДЖАЛЬНІК ШАЛЕНСТВА — ФІЛЬТРОЎНЫ ВІРУС

Пошукі ўзбуджальніка шаленства доўгі час заставаліся без выніку. Дапамагло выдатнае адкрыццё рускага вучонага Д. І. Іваноўскага, зробленае ў 1892 годзе. Ён даказаў, што, апрача вядомых у той час мікробаў велічынёй $^1/_{1000}$ часткі міліметра (мікрона), ёсць яшчэ іншыя ўзбуджальнікі заразных хвароб чалавека, жывёл і раслін, у многа разоў меншыя. Іх велічыня вылічаецца мілімікронамі, г. зн. тысячнымі часткамі мікрона. Яны такія малыя, што не бачны пад звычайным мікраскопам і ў адрозненне ад іншых мікраарганізмаў праходзяць праз найдрабнейшыя адтуліны спецыяльных бактэрыяльных фільтраў, выраблямых з асобых гатункаў гліны або азбесту.

Гэтыя надзвычай мізэрныя па сваіх размерах узбуджальнікі не растуць на звычайных для мікробаў пажыўных асяроддзях і здольны размнажацца толькі ў жывым арганізме або ў жывой клетцы. Яны вядомы пад назвай фільтроўных вірусаў. Да фільтроўных вірусаў адносіцца таксама ўзбуджаль-

нік шаленства. Размеры гэтага віруса 100—150 мілімікронаў. У сучасны момант вірус шаленства ўдаецца ўбачыць з дапамогай электроннага мікраскопа, які ў многа разоў павялічвае прадмет у параўнанні са звычайным мікраскопам.

ШЛЯХІ ЗАРАЖЭННЯ ШАЛЕНСТВАМ

Шаленства перадаецца слінай ад хворай шаленствам жывёлы. Шаленствам могуць хварэць чалавек, жывёлы і птушкі. Чалавек часцей заражаецца ад сабак, кошак, ваўкоў, лісіц. Найбольш небяспечным з'яўляецца ўкус ваўка і лісіцы. Таксама небяспечны ўкусы шалёных кошак і сабак. Ад сабак, ваўкоў і лісіц заражаюцца шаленствам і сельскагаспадарчыя жывёлы. Крыніцай заражэння шаленствам могуць служыць таксама пацукі.

Узбуджальнік шаленства, папаўшы ў арганізм чалавека разам са слінай хворай жывёлы праз укус, драпіну, ранку, распаўсюджваецца па нервах, заносіцца ў галаўны і спінны мозг, пашкоджвае гэтыя важнейшыя для жыцця органы. Пры наяўнасці драпін або ранак на скуры заражэнне магчыма пры судакрананні з забруджаным прадметам, на які папалі сліна або мозг шалёнай жывёлы.

Найбольш небяспечнымі з'яўляюцца ўкусы ў твар, шыю, галаву, кісці рук. У гэтых выпадках захворванне можа настаць пасля вельмі кароткага скрытага перыяду, калі неадкладна не пачаць узмоцненае лячэнне. Кожная гадзіна прамаруджання можа каштаваць жыцця чалавеку.

АДЗНАКІ ШАЛЕНСТВА

Чалавек, які заразіўся шаленствам, некаторы час пасля ўкусу і зажыўлення раны адчувае сябе здаровым. Пасля сканчэння так званага скрытага перыяду за адзін або два дні да захворвання паяўляюцца пачырваненне, прыпухласць і боль на месцы зажыўшай пасля ўкусу раны. Яўнай адзнакай настаўшай хваробы ў чалавека часта з'яўляецца павышаная адчувальнасць да руху паветра. Найменшы подых ветру выклікае ў хворага расстройства дыхання, ён баіцца прытоку свежага паветра. Хутка паяўляецца водабоязь, парушаецца глытанне. Варта хвораму падаць ваду, як у яго тут-жа пачынаюцца сутаргі глытальных мышцаў. Хвароба цягнецца нядоўга. Праз 2—3 дні настаюць паралічы. Выратаваць такога хворага ўрачы не маюць магчымасці.

У сабакі шаленства часцей праяўляецца ў буйнай форме. Скрыты перыяд у яго цягнецца 1—2 месяцы, а часам да 1—1,5 года пасля заражэння.

З надыходам хваробы паводзіны сабакі змяняюцца. Ён часта праяўляе неспакой, ліжа і раздзірае зубамі месца былога ўкусу, глытае неядомыя прадметы — каменні, кавалкі дрэва і г. д. Захварэўшы шаленствам сабака імкнецца збягаць з дому свайго гаспадара. Такі сабака можа прабегчы да 50 кіламетраў у дзень. Ён без усякай прычыны кідаецца кусаць іншых сабак, людзей і нават свайго гаспадара. Ніжняя сківіца ў гэты перыяд хваробы адвісае, з рота цячэ сліна. Нарэшце настаюць паралічы і на 6—8 дзень хваробы сабака гіне. Бывае

і «ціхая» форма шаленства ў сабакі, без праяўлення яўных адзнак узбуджэння. Вадабоязь і слінацячэнне не з'яўляюцца абавязковымі адзнакамі шаленства ў сабак. У кошак шаленства звычайна працякае, як і ў сабак.

АДКРЫЦЦЁ ПРЫШЧЭПАК СУПРОЦЬ ШАЛЕНСТВА

У 1885 годзе французскі вучоны Луі Пастэр распрацаваў спосаб засцерагальных прышчэпак супроць шаленства.

Пастэр устанавіў, што ўзбуджальнік шаленства знаходзіцца ў тканцы мозгу. Калі здробнены мозг шалёнага сабакі ўвесці ў мозг здароваму трусу, то праз 18—20 дзён трус захварэе шаленствам.

Гэта было геніяльным адкрыццём. Неўзабаве высветлілася, што пры паслядоўным заражэнні здаровых трусоў эмульсіяй тканкі мозгу трусоў, загінуўшых ад шаленства, уноў заражаныя захворваюць хутчэй. Пасля некалькіх такіх паслядоўных заражэнняў адзнакі шаленства ў трусоў пачалі паяўляцца на 6—7 дзень.

Адначасова з гэтым увага Пастэра была прыцягнута тым, што вірус, які выклікаў паскоранае захворванне ў трусоў, стаў менш небяспечным для іншых відаў жывёл, у тым ліку і для сабак. Шляхам высушвання мозгу ўдалося зрабіць вірус яшчэ больш бясшкодным. Высушаны мозг труса, які змяшчае «аслаблены» вірус, раствораны ў фізіялагічным растворы, быў выкарыстан Пастэрам у якасці вакцыны супроць шаленства. Прышчэпкі, зробленыя гэтай вакцынай, засцерагаюць жывёл ад заражэння шаленствам.

Вакцына супроць шаленства атрымала назву антырабічнай (па латыні: анты — супроць, рабіес — шаленства) і была Пастэрам выкарыстана для папярэджання шаленства ў людзей, пакусаных шалёнымі жывёламі.

ПАПЯРЭДЖАННЕ ПАКУСАНЫХ АД ЗАХВОРВАННЯ ШАЛЕНСТВАМ

Вучоныя аднесліся з вялікай увагай да адкрыцця Пастэра. Яго сябрам і вучнем быў рускі ўрач Н. Ф. Гамалея, які ўжо праз год (у 1886 г.) арганізаваў прышчэпкі супроць шаленства ў г. Одэсе і даказаў надзвычай вялікую карысць іх. Неўзабаве і ў іншых гарадах нашай краіны (Ленінград, Харкаў, Кіеў і г. д.) былі адкрыты ўстановы для вырабу антырабічнай вакцыны і правядзення прышчэпак пакусаным (пастэраўскія станцыі).

У Совецкім Саюзе створаны ўсе неабходныя ўмовы для своечасовага правядзення пакусаным прышчэпак супроць шаленства. У сучасны момант з мэтай набліжэння прышчэпак да насельніцтва ва ўсіх гарадах і раёнах СССР арганізаваны пастэраўскія пункты, якія поўнасцю забяспечаны антырабічнай вакцынай. Вакцына дастаўляецца ў самыя аддаленыя куткі нашай краіны.

Шаленства можна папярэдзіць толькі прышчэпкамі. Калі пакусаны своечасова прышчэпак не рабіў і наступіла захворванне шаленствам, выратаваць такога хворага ад смерці не ўдаецца.

Скрыты, або інкубацыйны, перыяд — гэта час, які праходзіць ад моманту ўкусу да праяўлення адзнак хваробы і звычайна цягнецца ад 12—15 дзён да 3 і больш меся-

цаў. За ўказаны перыяд удаецца з дапамогай прышчэпак стварыць неўспрыімлівасць і амаль што ва ўсіх выпадках папярэдзіць захворванне шаленствам.

Прыкладам можа быць наступны выпадак. У адну красавіцкую раніцу з лесу выбег воўк, уварваўся ў калгасны статак, нанёс укусы пастуху, накінуўся на жывёлу і пакусаў некалькі кароў і значную колькасць авечак. Калі жыхары вёскі прыбеглі на дапамогу, воўк пакусаў яшчэ 7 чалавек. Усе пакусаныя былі змешчаны ў бальніцу, дзе ім з першага-ж дня назначылі адпаведны курс прышчэпак супроць шаленства. Людзі былі выратаваны, ні адзін з іх не захварэў. Пацярпеўшыя ад укусаў каровы і авечкі, якім прышчэпкі не праводзіліся, захварэлі шаленствам і загінулі. Такіх прыкладаў лячэбнага дзеяння прышчэпак можна прывесці многа. Аднак, нажаль, бываюць выпадкі іншага характару.

У суседняй вёсцы дзяўчынка 6 гадоў была пакусана сабакам у нагу. За медычнай дапамогай бацькі звярнуліся на трэці дзень пасля ўкусу. Назначаны са спазненнем курс прышчэпак супроць шаленства быў самавольна спынен пасля 2 дзён лячэння. Нягледзячы на незвычайныя паводзіны кусаўшага сабакі і надышоўшую за гэтым яго смерць, бацькі пакусанай катэгарычна адмовіліся рабіць далей прышчэпкі дзяўчынцы. Праз 65 дзён пасля ўкусу дзяўчынка захварэла шаленствам і выратаваць яе ўжо было немагчыма.

Своечасова зробленыя прышчэпкі надзейна засцерагаюць чалавека, пакусанага падазронай на шаленства жывёлай, ад захворвання шаленствам. Але для гэтага неабходна ва

ўсіх выпадках укусу ўсякай жывёлы заразжа звярнуцца за медычнай дапамогай. Устаноўлена, што жывёла змяшчае ў сваёй сліне ўзбуджальніка шаленства ў апошнія 8—14 дзён скрытага перыяду, г. зн. да паяўлення яўных адзнак хваробы. Гэта значыць, што жывёла, будучы з выгляду яшчэ здаровай, можа заражаць шаленствам.

У пастэраўскіх пунктах укушаным аказваецца першая медычная дапамога, апрацоўваецца рана, назначаецца і праводзіцца неабходны курс прышчэпак. Працягласць курса залежыць ад месца і цяжкасці ўкусу, прычыненага чалавеку шалёнай або падазронай на шаленства жывёлай, і ўстанаўліваецца ў адпаведнасці з правіламі (інструкцыяй) ад 15 да 30 дзён. Пры асабліва цяжкіх укусах назначаецца паўторны курс лячэння.

Прышчэпкі пераносяцца чалавекам лёгка і безбалесна. Яны праводзяцца штодзённа без пропускаў. Для таго каб гэтыя прышчэпкі зрабілі сваё дзеянне на арганізм пакусанага чалавека, строга забараняецца ўжыванне спіртных напіткаў (гарэлкі, піва, віна і інш.) на працягу 6 месяцаў з дня пачатку лячэння. Асобы, якім робяцца прышчэпкі супроць шаленства, могуць весці свой звычайны парадак жыцця. Для навакольных гэтыя людзі не маюць небяспекі. У час прышчэпак рэкамендуецца мыцца ў лазні або ў ванне не радзей аднаго разу ў тыдзень. Трэба таксама не ператамляцца і засцерагаць сябе ад ахаладжэння і перагравання.

Калі паблізу няма пастэраўскага пункта, трэба звярнуцца ў бліжэйшую лячэбную ўстанову, дзе пакусанаму аказваецца першая дапамога і выдаецца накіраванне ў пастэраў-

скі пункт для правядзення прышчэпак супроць шаленства.

У выпадку, калі паблізу няма медыцынскай установы, трэба адразу-ж пасля ўкусу самім старанна прамыць рану вадой і апрацаваць на працягу некалькіх мінут ёднай настойкай. Высмоктваць рану ротам не дазваляецца.

Аказанне першай дапамогі не вызваляе пацярпеўшага ад правядзення курса прышчэпак супроць шаленства, за якім ён павінен звярнуцца ў бліжэйшы пастэраўскі пункт або ў бліжэйшую бальніцу ці амбулаторыю.

УТРЫМАННЕ ЖЫВЁЛ

Кожная жывёла, незалежна ад вонкавых яе паводзін, калі яна ўкусіла чалавека або абслініла яго, разглядаецца як падазроная на шаленства. Жывёла, якая ўкусіла чалавека, павінна знаходзіцца на прывязі ў ізаляваным, асобным памяшканні на працягу 14 дзён і ўвесь гэты перыяд быць пад наглядам ветэрынарнага ўрача. У выпадку паяўлення адзнак шаленства жывёлу трэба забіць і знішчыць. Трупы шалёных жывёл разам са шкуркай неабходна спальваць або закопваць у ямы глыбінёй не менш 2 метраў. Калі сабака пасля сканчэння 14-дзённага нагляду аказаўся здаровым, значыць ён у дзень укусу не меў у сваёй сліне ўзбуджальніка шаленства, і на гэтай падставе пачатыя ўкушанаму чалавеку прышчэпкі могуць быць спынены.

Для засцерагання людзей ад укусаў неабходна правільна ўтрымліваць сабак. Заўсёды трэба пазбягаць непатрэбных зносін з сабакамі і кошкамі. Гэта асабліва даты-

чыць дзяцей. Паляўнічых, службовых і вартавых сабак трэба трымаць на прывязі і ахоўваць іх ад укусаў безнаглядными сабакамі. Выводзіць сабак дазваляецца толькі на павадку і ў намордніку. Трэба таксама засцерагаць сельскагаспадарчых жывёл ад укусу іншымі жывёламі, галоўным чынам ваўкамі, лісіцамі, сабакамі.

Калі жывёла захварэе, трэба неадкладна звярнуцца да ветэрынарнага ўрача або даставіць яе ў ветэрынарную лячэбніцу. Нярэдкі выпадкі, калі ўкусы людзям наносяцца шалёнымі жывёламі пры спробе даць ім лякарства. Гэта бывае таксама, калі цяжкае глытанне ў захварэўшых шаленствам жывёл выклікае падазрэнне, што ў горла жывёлы трапіла костка, якую гаспадар стараецца дастаць.

БАРАЦЬБА З ШАЛЕНСТВАМ СЯРОД ЖЫВЁЛ

Асноўным мерапрыемствам у барацьбе з шаленствам чалавека з'яўляецца папярэджанне гэтага захворвання ў жывёл. Для таго каб ліквідаваць шаленства сярод жывёл, трэба арганізаваць вылоўліванне і знішчэнне безнаглядных і бяздомных сабак і кошак.

Неабходна стражэйшым чынам захоўваць устаноўленыя правілы ўтрымлівання дамашніх сабак. Іх трэба зарэгістраваць у мясцовым комунальным аддзеле і трымаць на прывязі або ў закрытых памяшканнях. Выводзіць сабаку на вуліцу можна толькі на павадку і ў намордніку. Да ашыйніка павінен быць прымацаван нумарны знак.

Уся работа па вылоўліванню і знішчэнню бяздомных сабак і кошак павінна быць арга-

нізавана мясцовымі комунальнымі аддзеламі з удзелам ветэрынарна-санітарных устаноў. Насельніцтва павінна аказваць усялякую дапамогу ў правядзенні гэтых надзвычай важных мерапрыемстваў.

У нашай рэспубліцы, багатай лясамі, ёсць нямала драпежнікаў (ваўкоў, лісіц і інш.), якія з'яўляюцца крыніцай заражэння шаленствам. Вылоўліванне і знішчэнне гэтых звяроў — абавязковая задача паляўнічых.

Пры паяўленні ў населеным пункце шалёнай або падазронай на шаленства жывёлы неабходна тэрмінова паведаміць аб гэтым мясцовым органам міліцыі, ветэрынарным работнікам і папярэдзіць навакольнае насельніцтва.

Калі шалёная або падазроная на шаленства жывёла пакусае дамашнюю жывёлу (карову, каня і інш.), трэба неадкладна звярнуцца да ветэрынарнага ўрача для назначэння пакусанай жывёле прышчэпак супроць шаленства.

Сельскагаспадарчыя жывёлы пасля ўкусу аддзяляюцца на 6 месяцаў ад астатняй жывёлы і на працягу ўсяго гэтага часу знаходзяцца пад наглядам ветэрынарнага ўрача. Павінна таксама прадугледжвацца бяспека людзей, даглядаючых пакусаных жывёл.

Шалёных жывёл неабходна зараз-жа пасля іх выяўлення забіваць і трупы спальваць ці закопваць у ямы глыбінёй не менш 2 метраў. Шкуры здымаць з шалёных жывёл строга забараняецца.

Сабак і кошак, падазроных на шаленства, а таксама ўкушаных іншымі шалёнымі жывёламі, трэба неадкладна знішчаць. Выключэннем з'яўляюцца выпадкі, калі патрабуецца

14-дзённы нагляд за жывёлай, пакусаўшай чалавека. Пасля сканчэння гэтага тэрміну нагляду кусаўшы сабака або кошка ў залежнасці ад выніку ветэрынарнага нагляду вяртаецца гаспадарам або знішчаецца. Для дамашніх сабак побач з правільным іх утрыманнем рэкамендуюцца засцерагальныя прышчэпкі супроць шаленства, якія праводзяцца ветэрынарнымі лечустановамі.

Мерапрыемствы па барацьбе з шаленствам прадугледжаны пастановай урада і з'яўляюцца абавязковымі.

Сумеснымі намаганнямі савецкіх і грамадскіх арганізацый, ветэрынарных устаноў, органаў аховы здароўя пры садзейнічанні шырокіх мас насельніцтва шаленства павінна быць у бліжэйшы час ліквідавана.

Для засцерагання сябе і іншых ад захворвання шаленствам запомніце наступныя асноўныя правілы:

Адзіным сродкам для засцерагання пакусанага ад смяротнага захворвання шаленствам з'яўляюцца своечасовыя прышчэпкі.

Заражэнне шаленствам магчыма пры ўкусе шалёнай і здаровай на выгляд жывёлы. Заражэнне бывае не толькі пры ўкусе і драпінах, але і пры пападанні сліны хворай жывёлы на пашкоджаную скуру і слізістыя абалонкі вока, носа, рота.

Пры ўсякім укусе і абсліненні жывёлай звяртайцеся ў пастэраўскі пункт або ў бліжэйшую медыцынскую ўстанову для правядзення курса прышчэпак супроць шаленства.

Спыніць прышчэпкі супроць шаленства можна толькі ў тым выпадку, калі пасля 14-дзённага ветэрынарнага нагляду за пакусанай жывёлай яна аказалася здаровай. У час

нагляду жывёла павінна знаходзіцца на прывязі ў асобным памяшканні.

Трымайце сабак на прывязі. Выводзьце іх на вуліцу на павадку і ў намордніку. Няправільнае ўтрымліванне сабак і кошак з'яўляецца галоўнай прычынай распаўсюджвання смяротнага захворвання шаленствам.

Усяляк дапамагайце мясцовым камунальным аддзелам у правядзенні мерапрыемстваў па вылоўліванню і знішчэнню безнаглядных і бяздомных сабак і кошак, якія з'яўляюцца пераносчыкамі шаленства.

Пры паяўленні шалёнай або падазронай на шаленства жывёлы неадкладна паведаміце ветэрынарнай установе, а таксама папярэдзьце навакольнае насельніцтва.

Неабходным мерапрыемствам у барацьбе з шаленствам з'яўляецца знішчэнне паляўнічымі ваўкоў і іншых драпежнікаў, бо яны маюць вялікую небяспеку для людзей, якіх яны кусаюць, а таксама з'яўляюцца крыніцай распаўсюджвання шаленства сярод жывёл.

ЗМЕСТ

Стар.

Узбуджальнік шаленства — фільтроўны вірус . 3
Шляхі заражэння шаленствам 4
Адзнакі шаленства 5
Адкрыццё прышчэпак супроць шаленства. . . 6
Папярэджанне пакусаных ад захворвання шаленствам 7
Утрыманне жывёл 10
Барацьба з шаленствам сярод жывёл . . . 11

На белорусском языке

Д. Е. Зибицкер

Бешенство и способы борьбы с этим заболеванием

Государственное издательство БССР
Минск 1956

*

Рэдактар *Б. Эльберт*
Тэхрэдактар *А. Труханава*
Карэктар *Л. Баўдзей*

АТ 01278. Падп. да друку 10|III 1956 г.
Тыраж 10 000 экз. Фармат 70×92/32.
Фіз. друк. арк. 0,5. Умоўн. друк. арк. 0,59.
Уч.-выд. арк. 0,5. Бясплатна.
Зак. 106.

Друкарня імя Сталіна,
Мінск, праспект імя Сталіна, 105.

197